Листи І. Чендея є “органічною частиною” літературного набутку закарпатського прозаїка, адже вони відтворюють “шматочки” з пережитого ним творчого життя й буття як людини, творять “образ” цільної й непересічної натури справжнього митця, у них зримо відчутний саме отой “образ часу і образ героя”, про що слушно писав І. Денисюк. Маємо всі підстави стверджувати, що листи І. Чендея – це першоджерело виняткової ваги, бо саме вони дають можливість глибше осмислити ту епоху, коли жив і працював митець, заглянути в творчу робітню письменника, об’єктивно оцінити шляхи розвитку української літератури та заслуги її творців на зламі епох, зрештою, збагнути, що “корисного для свого рідного народу” зробив саме кожен письменник, і, зокрема, І. Чендей.

**Список літератури**


1 Чендей, І. Від пісні і життя : [Про роботу в жанрі новели] / Іван Чендей // Рад. літературознавство. – 1966. – № 12. – С. 49–55.

2 Скунць, П. Патріархальний чи патріарх ? : Спроба прочитати Івана Чендея в рік його 80-ліття / Петро Скунць // Дзвін. – 2002. – № 5–6. – С. 140.

3 Бабишкін, О. Вікна у світ [рец. на кн. : Чендей І. Терен цвіте : Новели. Повість. – К. : Дніпро, 1967. – 463 с. ] // Літ. Україна. – 1967. – 01 верес. – № 69 (2455). – С. 3.

4 Чендей, І. Листи до Кості Волинського / Іван Чендей // Приватний архів К. П. Волинського, м. Київ.

5 Чендей, І. [З виступу на наук. конф. в Ужгород. ун-ті, трав. 1966 р.] / Іван Чендей // Рад. літературознавство. – 1966. – № 8. – С. 16–18.

6 Чендей, І. Від пісні і життя : [Про роботу в жанрі новели] / Іван Чендей // Рад. літературознавство. – 1966. – №12. – С. 49–55.

7 Чендей, І. “Я щасливий від спілкувань з Вами” [Листи І. Чендея до О. Гончара; публ. В. Гончар] // Слово Просвіти. – 2012. – Ч. 28 (665). – 12–18 лип. – С.10–12.

8 Чендей, І. Криниця мудрості й любові : [Інтерв’ю / зап. Т. Грицищук] // Новини Закарпаття. – 2000. – 20 трав. – С. 12.

9 Кіраль, С. “… Зробити щось корисне для свого рідного народу” : З епістолярної спадщини Івана Чендея : монографія. – Ніжин : Видавець ПП Лисенко М. М., 2013. – 212 с.

10 Аврахов, Г. Майстер новели : [передм.] / Григорій Аврахов / Чендей І. Терен цвіте : новели, повість. – К. : Дніпро, 1967. – С. 5–13.

11 Чендей, І. Листи до Кості Волинського / Іван Чендей // Приватний архів К. П. Волинського, м. Київ.

12 Кіраль, С. “… Зробити щось корисне для свого рідного народу” : З епістолярної спадщини Івана Чендея : Монографія. – Ніжин : Видавець ПП Лисенко М. М., 2013. – 212 с.



УДК 821.161.3 –1’06 – 055. 2:177.6



М. І. КІРУШКІНА
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)


## МАСТАЦКАЯ РЭАЛІЗАЦЫЯ КАНЦЭПТА “КАХАННЕ” Ў СУЧАСНАЙ ЖАНОЧАЙ ПАЭЗІІ


Спецыфіка сучаснай “жаночай паэзіі” заключаецца ў выкарыстанні паэткамі гендарнай паэтыкі ў раскрыцці мастацкага канцэпта “каханне”. Мэта дадзенага артыкула – вызначыць асноўныя мастацкія асаблівасці ў канструяванні сінтэтычна-паэтычнай мадэлі кахання адносна класічных элементаў – “цялеснага” і “духоўнага”. Творчасць сучасных паэтак з’яўляецца мала даследаванай айчынным літаратуразнаўствам, што абумоўлівае навізну працы.


У сучаснай культурнай традыцыі паняцце канцэпта належыць нацыянальнай свядомасці, паколькі ўключаецца ў “вертыкальны кантэкст” – абазначае ўласцівасці філасофскіх феноменаў. Згодна з літаратуразнаўчым аналізам, прапануем наступную дэфініцыю адзначанага тэрміна



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– гэта культурна-вербалізаваны сэнс, прадстаўлены ў плане выражэння (у тэксце) шэрагам філасофскіх рэалізацый, якія ўтвараюць адпаведную парадыгму.

“Каханне як «універсалія культуры», у якой фіксуюцца адносіны да аб’екта, уяўляе сабой канцэпт у квадраце: яно фарміруе сэнс індывідуальнага жыцця праз выхад за межы асобнага быцця” [1].

У творчасці сучасных паэтак каханне тлумачыцца як захапленне і натхненне, як воля да ўлады і разам з тым імкненне да вернасці, як адметная форма творчасці ва ўсіх яе аспектах і як складанае ўзаемадзеянне біялагічнага і інтымнага, асабістага і сацыяльна значнага. Але філасофская навука мае розныя азначэнні дадзенага канцэптуальнага паняцця. Паняцце любові ў інтэрпрэтацыі З. Фрэйда [2] – гэта абагульненне ўсяго таго, што адбываецца ад энергіі першапачатковых імпульсаў (лібіда) – гэта значыць фізічнага кахання – да любові бацькоў, дзяцей, сяброўства і агульначалавечай любові. У псіхалагічным і сацыяльным трактаце “Аб каханні” Стэндаль [3] вылучыў чатыры формы гэтага пачуцця:

– каханне-страсць, якое прымушае асобу ахвяраваць сваімі ўласнымі інтарэсамі і захапленнямі;

– каханне-жаданне, у якім няма гарачага і непрадбачанага пачуцця. Гэта форма найбольш прыгожага кахання;

– фізічнае каханне, што заснавана на задавальненні;

– каханне-славалюбства, якое суадносіцца з экзальтацыяй (звычкай атрымліваць задавальненне).

Паводле Э. Фрома [4], каханне – гэта адказ на праблему чалавечага існавання. Даследчык філасофскай думкі лічыць, што каханне – гэта не абавязкова адносіны да пэўнага чалавека; гэта ўстаноўка, арыентацыя характару, якая вызначае адносіны чалавека да свету ўвогуле, а не толькі да аднаго “аб’екта” любові.

Сучасная беларуская жаночая паэзія прадстаўлена такімі імёнамі, як В. Бурлак, Д. Ліс, Я. Дашына, А. Данільчык, А. Спрынчан, Л. Сом і інш. Дамінантнай у іх творчасці з’яўляецца менавіта любоўная тэматыка. Страсць, інтымнасць, жаданне, закаханасць, шчасце, сум, адзінота, расстанне – асноўныя канцэптуальна-жыццёвыя складнікі *канцэпта* “*каханне*” ў разуменні сучасных аўтараў. У філасофскім аспекце такая мадэль разглядаецца, як “гарманічнае адзінства цела і душы, якое мае сімвалічную траекторыю гэтага дасягнення – ад эратычнай улюбёнасці да меламаніі і любові да неба і зорак” [5, с. 579].

У сучаснай сітуацыі мультыкультуралізму папулярна трохкампанентная мадэль дасканалага кахання Р. Стэрнберга [6], якое мае назву “Balanced Triangle”, то бок сбалансаваны трохкутнік. Згодна яго тэорыі ўсе тры кампаненты (страсць, абавязкі, інтымнасць) знаходзяцца ў стане раўнавагі. Практычнае значэнне дадзеная формула набывае ў камбінацыі наступных характарыстык:

– сувязі сексуальнасці і інтымнасці, што існуе пры рамантычным каханні, але мае на ўвазе каханне эратычнае;

– сувязі інтымнасці і адказнасці ў межах таварыскай любові або партнёрскай любові, з якой выключана сексуальнасць.

Каханне як метафізічны канцэпт вызначае ментальныя сутнасці высокай абстрактнасці, а сэнс духоўных каштоўнасцей выяўляецца праз сінтэз з іншымі катэгорыямі, то бок вобразна-прадметны змест выкарыстоўваецца для выражэння зместу абстрактнага.

Асноўнай аналітычнай адзінкай для вывучэння псіхалогіі асобы з’яўляецца пачуццё. У сферы эмацыянальных адносін дамінантнае месца належыць каханню, у прыватнасці, каханню-апантанасці. Такое пачуццё балансуе ад максімальнага жадання авалодаць аб’ектам любові да глыбокай адданасці. Так нараджаецца актыўная форма любові – каханне-страсць, што імкнецца да ідэалізацыі пачуцця.

У этычным разуменні з паняццем любові звязаны інтымныя і глыбокія пачуцці, адметны від свядомасці, духоўны стан і дзеянні, якія накіраваны на аб’ект сімпатыі. Складанасць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

любові вызначаецца тым, што ў гэтым пачуцці найбольш арганічна спалучаны духоўныя і фізіялагічныя адчуванні чалавека. Таму ў псіхалагічна-эмацыянальнай сферы асобы існуе эратычнае каханне. Для выражэння і тлумачэння аспектаў любові старажытныя грэкі выкарыстоўвалі пэўныя тэрміны. Паняццем "эрас" яны тлумачылі пачуцці, накіраваныя на прадмет з мэтай цалкам авалодаць ім. Гэты тэрмін выражае каханне-жарсць, рэўнасць і адчувальную цягу, якая звязана з яго пафасам, афектнай сентыментальнай часткай. Эрас – гэта моцнае гарачае пачуццё, зачараванае каханне.

У паэтычнай творчасці Я. Дашынай рэалізавана адметная тэорыя **любові-страсці**, якая з'яўляецца крыніцай існавання для асобы. Лірычная гераіня паэткі акцэнтуе ўвагу на такой акалічнасці: "Там у перашкода-ўстойлівым небыцці / стратэгічным пунктам апоры – / стане каханне" [7, с. 16]. Унутраныя перажыванні жанчыны за свой лёс у сучасным пакутным свеце ператвараюцца ў мастацтва кахаць. Але наяўнасць такога тыпу любові звязана з дзейнасцю душы, паколькі ў стане закаханасці і эратычнага памкнення рацыянальнае светабачанне не мае сэнсу. "Эрас ёсць закаханасць у жыццё, «афект быцця» (Фіхтэ), прага паўнаты, прага паўнавартаснасці, нараджэння ў прыгажосці, прага вечнага жыцця" [8, с. 16].

Эрас у вершатворчасці Я. Дашынай мае свае адметныя ўласцівасці: духоўна-эмацыянальную скіраванасць, хуткасць і энергію ўзнікнення пачуцця як квінтэсэнцыю кахання-страсці; рэальнасць / ірэальнасць яго існавання ў свядомасці асобы. Паняцце кахання ў вершах паэткі атаясамліваецца з жыццёвай патрэбай, што дапамагае павялічыць узровень пачуццёвасці. Эрас (як пачуццё) – гэта сродак гармоніі з самой сабой і са светам неўсвядомленых фантазій, што падпарадкаваны мінулым адчуваннем і адносінам. Жаданне адчуваць, імкненне да паўнавартаснага авалодвання аб'ектам кахання ўтварае своеасаблівы інтымны стан душы лірычнай гераіні: "Мецъ слых – і не пачуць твой голас / мець зрок – і не пабачыць вочы <…> Я ўспамінаю тваё цела / ў снах, дзе час так проста зблытаць з свядомасцю" [7, с. 35]. Прыродны інстынкт "кахаць і быць каханай" не перашкаджае гераіне нават у анірычнай рэальнасці спраўдзіць свае мары пра зліццё з аб'ектам кахання.

Сучасная філасофія сцвярджае: "Неўсвядомленая пабуджальная сіла любові – сексуальная цяга, якая ўзнікае з фізіялагічнай крыніцы. Дадзеная энергія можа быць звязана са знешнімі ўзбуджальнымі «прадметамі», да якіх адносяць прыгожы твар, вызначальныя часткі цела, розныя выяўленні і фантазіі" [6, с. 363]. Паводле Я. Дашынай, статычнае жыццё дасягае апафеозу ў момант пяшчотна-інтымных адносін: "Не будзе вясельнага здымка / у сямейным альбоме… / Нахабная ноч у абдымках / шалёных агоній [7, с. 30].

Мастацкая тэорыя кахання паэткі пачынаецца з рэалізацыі ў вершатворчасці самасвядомай формы інтымных зносін паміж закаханымі. Тып такой любові, згодна сучасным сацыяльным прыкладам, не толькі нараджае задавальненне, але і з'яўляецца прыкладам усеагульнага шчасця. Эратычнае каханне – з'ява ірацыянальная, паколькі не прадугледжвае ўсвядомленай пакуты. Асноўная ўмова такога гарачага пачуцця – мнеманічныя рэакцыі на дыялог паміж закаханымі: "На памяць стогн / на памяць уздых / на памяць міліметры цела / Адольвала цябе на слых / навобмацак цябе хацела" [7, с. 50]. У вышэй прыведзеных радках трансфармацыя эратычнай энергіі ў веліч страсці садзейнічае самасцвярджэнню свабоды. Каханне мае неабмежаваныя ўласцівасці: імкненне пераадолець існуючы рытм жыцця. Важнае значэнне набывае цялеснасць, бо знешнія якасці выключаюць індывідуальны выбар у каханні.

М. Бердзяеў [9] вылучаў два тыпы любові: узыходзячую (эратычную) і сыходную (агапічную). Першая (любоў-эрас, любоў-сімпатыя) характарызуецца прыцяжэннем, захапленнем аб'ектам любові. Такі Эрас – гэта шлях да ўдасканалення свету ідэй праз пачуццёвы свет, які мае трагічны характар. Другая – любоў-жаль, любоў-спачуванне, што не патрабуе нічога ўзамен. Адрозненне заключаецца ў тым, што любоў эратычная ёсць злучэнне з *іншым* у Богу. Адметнасць такой тыпалогіі ў стварэнні сапраўднай любові, якая мае адценні двух тыпаў.

Разуменне любові патрабуе наяўнасці інтуіцыі, уменняў канцэнтравацца на адзіным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

любоўным стане. Камбінацыя апантанага кахання і адначасова яго духоўнага кампанента дэманструецца Я. Дашынай у наступных паэтычных радках:

Выкраду твае дыханне,
каб было лягчэй
дыхаць-дыхаць, перадыхаць
тысячы начэй,
безліч апастылых думак,
шмат крутых дарог…
Ты мне не патрэбны, мілы,
мне патрэбен
Бог [7, с. 18].

Акцэнтуацыя лірычнай гераіні на сваіх уласных перажываннях ператвараецца ў пошук сапраўднай гармоніі, што знаходзіцца ў рэчышчы прыцягальнай любові. Апантанасць, празмерная эмацыянальнасць, праявы глыбокай чуласці з’яўляюцца складнікамі кахання, якое спалучальнае з духоўным спакоем.

У паэзіі Я. Дашынай каханне-страсць мае двухаспектны патэнцыял: ірацыянальнае свабоднае захапленне аб’ектам любові (яго цялеснасцю) і чысты, прыгожы акт рэалізацыі пачуцця як вышэйшы сэнс існавання асобы (яго духоўны пачатак).

Каханне – паняцце антыпрагматычнае, якое стварае жыццёвае двуадзінства ў вечным імкненні індывіда да самадасканаласці. Абсалютная жыццёвая праўда рэалізуецца ў філасофска-эстэтычным значэнні пачуцця. Для жанчыны каханне – гэта крыніца шчасця, паколькі ў гэтым пачуцці яна бачыць рэалізацыю сваёй годнасці. На падсвядомым узроўні кожнай асобе патрэбна такое пачуццё да канкрэтнага вобраза, які будзе з’яўляцца ўвасабленнем яе прынцыпаў і ідэй. Але свядомая сфера арганізуе толькі фармальныя магчымасці дадзенага канкрэтнага зместу, то бок любоўнай энтрапіі.

Ідэя паэтычнай творчасці Д. Ліс – сцвердзіць каханне як спосаб вырашэння праблемы чалавечых адносін. Паэтка лічыць, што дадзенае пачуццё неабходна кожнай асобы і да яго можна ісці нават усё жыццё. Усведамленне сябе, сваёй сутнасці адбываецца праз любоў да супрацьлеглага пола. Мэта лірычнай гераіні Д. Ліс – актыўнае імкненне спазнаць каханне. У сучаснай парадаксальнай рэальнасці складана сустрэць сапраўднае ва ўсіх сэнсах “фенаменалагічнае пачуццё”. Таму ў паэзіі Д. Ліс увасоблена **каханне-адзінота**. Інтэрпрэтацыі сучасных сацыяльных стэрэатыпаў нараджае ў свядомасці лірычнай гераіні перажыванне за сваё пакутнае адзінокае жыццё: “Апала лістота / Шлях ідзе да зімы… / Каханне? Потым… / Ніяк не сустрэнемся мы” [10, с. 15].

Развіццё ўнутранай трывогі паслядоўна прыводзіць да стану адчужанасці, дзе пытанне пра сапраўданае каханне з’яўляецца другасным. Адзіны спосаб супакоіць душу – гэта зарыентаваць сябе на чаканне. Каханне для лірычнай гераіні можа ўвасабляцца як пачуццё, што існуе ў свядомасці як творчы кампанент зямнога існавання. Д. Ліс рэалізуе пэўныя этычныя стэрэатыпы ў адносінах паміж мужчынам і жанчынай: “Я не змагу – першая / Я жанчына … ўсё ж / Каханне (крэда!) – вяршамі / За вокнамі зорная ноч” [10, с. 15].

Дыялектыка чалавечых адносін вымагае таго, каб прытрымлівацца пэўных этычных, генетычна запраграмаваных паводзін. Пачуццё “ўласнага Я” перамагае, што ў сваю чаргу з’яўляецца доказам сцвярджэння духоўнай жаночай сутнасці.

Гераіня Д. Ліс існуе ў свеце фантазій і мары, што забяспечвае ёй духоўную раўнавагу паміж дзвюма плынямі чалавечых зносін: “Я балансую на мяжы / Сяброўства і кахання / Задумы / Мары / Міражы – выратаванне” [10, с. 16]. Кіраванне сваімі пачуццямі, праўдзівая ацэнка сваіх магчымасцяў арганізуе духоўна-фізічны працэс індывіда, дзе прыярытэт надаецца розным аспектам неўсвядомленай дзейнасці – марам і фантазіям.

У футурыстычным аспекце сыходны пункт разваг лірычнай гераіні ўсё-такі мае прагматычна-аптымістычны характар: “сустрэцца аднойчы – / Вочы ў вочы…” [10, с. 19].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пытанне пра сапраўднае каханне грунтуецца на веры ў праўдзівасць сваёй мары. У выніку гераіня прагназуе сябе на сустрэчу з аб'ектам сваёй любові: "Быць адною – нялёгка / Вечным станецца вечар / Выбачай, мой далёкі / Я іду да сустрэчы" [10, с. 20]. Каштоўнасць ісціны заключаецца ў тым, што сінтэз кахання і розуму ўтвараюць духоўную рэальнасць.

Згодна з Д. Ліс, каханне – самае вялікае дасягненне ў сферы жыцця, але ў працэсе свайго развіцця ўключае катэгорыю адзіноты. А жаданне пазбегнуць адзіноцтва душы – гэта імкненне асобы да першапачатковай сваёй цэласнасці ў фізічным і маральным аспектах.

Модус любові ў паэзіі А. Спрынчан мае паслаблены характар, бо адсутнічае эратычная скіраванасць пачуцця. Рэалізаваны прыклад неадпаведнага апантаным дзеянням пачуцця, што кантралюецца свядомасцю, прыведзены ў наступных радках:

У лабірынце празрыстага суму
блукае маё каханне
і не шукае выйсця –
так шмат у жыцці суму,
так мала празрыстасці… [11, с. 59].

**Каханне-сум** выконвае функцыю псіхалагічнай няздольнасці кахаць шчыра і адкрыта з элементамі палымянай жарсці і адначасова з'яўляецца крыніцай духоўна-эмацыянальнай нераўнавагі. Жыццё ўспрымаецца лірычнай гераіняй праз прызму немагчымасці супраціўляцца сваёй наканаванасці. "Каханне ва ўсіх аспектах – гэта не што іншае, як больш або менш непасрэдны адбітак, пакінуты ў сэрцы элемента псіхічнай канвергенцыяй да сябе ўніверсума" [12, с. 84]. Здаецца прымальнай ідэя аб тым, што кожны індывід сам вырашае свой лёс і валодае магчымасцю стварыць асабістую ідэалогію, дзе вектары пачуццёвасці арыентуюць яго на эмацыянальна-псіхалагічную стрыманасць.

У паэзіі А. Спрынчан дысгарманічны свет перашкаджае развіццю паўнавартаснай любові, таму Амур паэткі надзяляецца адценнямі суму і тугі.

Такім чынам, канцэпт "каханне" ў сучаснай жаночай паэзіі рэалізаваны паводле:

– існавання ў эмацыянальнай сферы жанчыны (лірычнай гераіні) неўсвядомленай пабуджальнай сілы любові;

– падпарадкавання ўласных пачуццяў свядомасці, што суправаджаецца адчуваннем адзіноты, меланхоліі, суму.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

### Спіс літаратуры

1 Воркачев, С. Сопоставительная этносемантика телеономных концептов "любовь" и "счастье" (русско-английские параллели): монография / С. Воркачев. – Волгоград: Перемена, 2003. – 164 с.

2 Фрейд, З. Введение в психоанализ: лекции / З. Фрейд ; пер. с нем. Г. Барышниковой. – М. : Наука, 1989. – 456 с.

3 Стендаль О любви / Стендаль; пер. с фр. М. Левберг и П. Губера. – Мн. : Высш. школа, 1979. – 232 с.

4 Фромм, Э. Искусство любить: Исследование природы любви / Э. Фромм. – М. : Педагогика, 1990. – 160 с.

5 Грицанов, А. Новейший философский словарь: 2-е изд., прераб. и дополн. / А. Грицанов. – Мн. : Интерпрессервис, 2001. – С. 578–580.

6 Райгородский, Д. Психология и психоанализ любви: учеб. пособие / Д. Райгородский. – Самара: Издательский Дом БАХРАХ-М., 2002. – 688 с.

7 Дашына, Я. Графіці на сэрцы / Я. Дашына. – М. : Литература и Искусство, 2007. – 128 с.

8 Вышеславцев, Б. Этика преображенного эроса / Б. Вышеславцев. – М. : Республика, 1994. – 368 с.

9 Черный, Ю. Философия пола и любви Н. А. Бердяева / Ю. Черный. – М.: Наука, 2004 – 132 с.

10 Ліс, Д. Вясновы джаз / Д. Ліс. – Гародня: "Гарадзенская бібліятэка", 2008. – 60 с.

11 Спрынчан, А. ЖываЯ / А. Спрынчан. – Мн. : Мастацкая літаратура, 2008. – 94 с.

12 Тейяр де Шарден, П. Любовь – энергия / П. Тейяр де Шарден // Философия любви. Ч. 2 ; под общ. ред. Д. Горского. – М. : Политиздат, 1990. – С. 83–87.